Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр. Для заграніцы ўдвая даражэй. Перамена адрэса 30 гр.

Непрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр. за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 46 | Вільня, Субота 10-га верасьня 1927 г. | Год I

Нядоля беспартыйных.

Ні для кога не сакрэт, што сярод беларускіх масаў толькі вельмі малая часьцінка пранікнена буржуазнай ідэалёгіяй. І калі павадыры нашае нараджаючаеся буржуазіі—ксяндзы, Ярэмічы, ды Рагулі, кулакі і спэкулянты, — твораць свае „партыі“, дык і яны, каб захапіць цёмных людзей, „падрабляюцца“ пад працоўную ідэалёгію, ды — хоць няшчыра—суляць і зямлю бяз выкупу сялянам, і ўладу працоўным, і іншыя пекныя рэчы, проці зьдзейсьненьня якіх самімі масамі працоўных змагаюцца ўсемі сіламі ды йдуць поплеч з пануючай у нас польскай буржуазіяй. Той стыхійны рух, які быў узьняўся на груньце масавага паступаньня ў Грамаду,—гэта-ж найлепшы паказчык настрояў беларускіх масаў.

Але Грамады цяпер няма. Няма, значыцца, такое *легальнае* арганізацыі, у якой маглі-б гуртавацца масы, захопленыя сялянска-работніцкай ідэалёгіяй. І дзеля гэтага прадстаўнікі гэтае ідэалёгіі прымушаны аставацца па-за ўсялякімі партыямі, расьцярушаныя ў масе *беспартыйных*.

Усё гэта — факты ведамыя, ясныя, бясспрэчныя. І калі да Грамады было ўпісана 90,000 беларусаў, дык-жа беспартыйных аставалася йшчэ больш за два міліёны.

Ня гледзячы на гэта, польская адміністрацыя ў Заходняй Беларусі павяла асаблівую тактыку. Хаця ў партыйныя арганізацыі йшлі найбольш сьведамыя, найбольш жывыя элемэнты нашае вёскі і места, хаця ў беспартыйных асталіся пераважна менш сьведамыя і менш актыўныя людзі,—аднак-жа цяпер, пасьля разгрому Грамады, улада ўсіх беспартыйных наагул разглядае, як „укрытых грамадаўцаў“.

Мо' для тэй ідэалёгіі, якую праводзіла Грамада, гэта й добра. Мо' й правільна, што сымпатыі ўсіх паўтраця міліёна беларусаў пад Польшчай—на старане сялянска-работніцкага руху. Але-ж бяда ў тым, што былыя грамадаўцы, як мы ўжо гэта нядаўна на гэтым месцы адзначалі, аказаліся пазбаўленымі адміністрацыяй грамадзкіх правоў—бяз ніякага суда, навет да скончэньня працэсу Грамады і яе павадыроў, што сядзяць у польскіх вастрогах. Мы ўжо падавалі факты недапушчаньня былых грамадаўцаў да самаўрадавае працы, да выпаўненьня тых абавязкаў, якія на іх ускладае насяленьне, выбіраючы іх за войтаў, лаўнікаў, сяброў соймікаў і т. п. — Але вось выяўляецца, што і да *беспартыйных* улада тасуе падобныя-ж рэпрэсіі: сьвежымі зьяўляюцца факты забароны цэламу раду беларускіх вучыцялёў нашых гімназіяў працаваць па сваей спэцыяльнасьці—з прычыны „неблаганадзёжнасьці“, хаця яны ніколі да Грамады й не належалі, а толькі *спагадалі* яе ідэалёгіі, аб чым услужліва інфармавалі польскую ўладу кс. Станкевіч, Ярэміч і Рагуля ў сваіх газэтах, а мо' і іншымі спосабамі... І выходзе так: калі ты не хадэк, не сельсаюзьнік, ды не пайшоў на службу да Паўлюкевіча, Умястоўскага, ці Гурына,—*знача* ты грамадавец, яўны ці тайны. І вось да цябе тасуюцца ўсе скарпіёны, празначаныя для *былых* грамадаўцаў!

Гэтакая палітыка вельмі карысна й выгадна для дзьвюх старон: для *польскае адміністрацыі*, якая глядзіць на беларускую справу з пункту гледжаньня вузкапаліцэйскага, і для ўсіх гэных беларускіх *служак буржуазнае ідэалёгіі*, у лапы якіх адміністрацыя гэтак заганяе людзей слабога духа й палахлівых. Бо-ж выходзе, што, каб атрымаць ад адміністрацыі „благанадзёжнасьць“, трэба ўпісацца ці то да хадэцыі, ці да сельсаюзьнікаў, ці да „нацыяналістаў“ або „палёнофілаў“. Тады цябе не пазбавяць правоў, тады не прагоняць з пасады й не пазбавяць хлеба...

Няма што казаць: спосаб дужа лоўкі! Ці дасьць пажаданыя для ўлады вынікі,—ну аб гэтым можна й паспрачацца: бо-ж ніхто з людзей, якія прадстаўляюць нейкую маральную вартасьць, таргаваць сваім сумленьнем дзеля куска хлеба ня будзе, і ў сеці ксяндзоў, ды розных служак буржуазіі могуць папасьці толькі элемэнты маральна найслабейшыя — найгоршыя. Лепшыя-ж будуць толькі гартавацца пад гэтымі ўдарамі, будуць толькі крапчэй верыць у правільнасьць сялянска-работніцкае ідэалёгіі.

Першае дваццаціпяцілецьце.

Беларускі адраджэнскі рух мае ўжо цягласьць бяз ніякіх перарываў—у працягу чверці сталецьця. І акурат сёлета прыпадае дваццаціпяцілетні юбілей цяглае беларускае культурна-нацыянальнае працы.

Праўда, на працягу ўсяго XIX сталецьця мы бачым тыя ці іншыя спробы наладзіць творчую працу на гэтай занядбанай беларускай ніве. Спробы гэтыя, аднак, ці то абмежываліся асабістай паэтыцкай творчасьцяй нашых паэтаў, ці захаплялі нейкі адзін мамэнт у нашым культурным руху, як этнаграфія, гісторыя і г. д., ці ўрэшце ўзьнімаліся на чыста палітычным груньце. А лёс іх быў заўсёды адзін: з адыходам ад працы ініцыятара яе канчаецца і самая праца, пакідаючы свой сьлед пераважна ў пісаных матэрыялах, з якіх карысталі ахвочыя людзі мо' ўжо ў другім пакаленьні. Гэтак, хоць сума нашае нацыянальнае творчасьці ўсьцяж узрастала,—аднак, у працы ня было цягласьці, дый яна ня здолела ў тыя часы захапіць шырэйшыя колы нашага грамадзянства. Адзінкі так і асталіся адзінкамі, не маглі павясьці за сабой масу, не траплялі да гэтае масы, а ўплывалі ізноў-жа толькі на адзінкі.

Чаму так рабілася?

Прычын было многа. Тут і палітычныя абставіны тых часоў, і дэнацыяналізацыя нашае інтэлігенцыі, якая, хоць і была па крыві беларускай і для беларускага народу працаваць хацела, усё ж лічыла сябе ці то за расейцаў, ці за палякоў... Але найважнейшай перашкодай дзеля зьліцьця ўсіх гэных паадзінокіх пачынаньняў у адзін суцэльны, аб'яднаны аднэй ідэяй рух было тое, што масы народныя спалі йшчэ непрабудным сном. І толькі тады, як масы пачалі патроху варушыцца, пачалі будзіцца зо-сну, — толькі тады, калі з гушчаў народу пачалі наплываць новыя і новыя творчыя сілы, — толькі тады кіненае ў народ добрае сем'я нацыянальнага адраджэньня ўзыйшло і дало плод. І толькі тады распачаўся запраўдны цяглы ўсенародны беларускі рух.

Адпаведны дзеля гэтага мамэнт насьпеў толькі ў самым пачатку нашага сталецьця. І—не гаворачы аб вучнёўскіх гуртках, якія закладаліся ў апошнія гады XIX сталецьця ў Менску, ды іншых мастах Беларусі, — мы мусім адзначыць, што толькі ў восеньні 1902 году паўстала да жыцьця першая беларуская грамадзкая арганізацыя, якая ясна і выразна паставіла перад сабой працу над нацыянальным адраджэньнем беларусаў, над будаваньнем падставаў сваей роднай культуры.

Арганізацыя гэта, якой дваццаціпяцілецьце выпадае сьвяткаваць, называлася „**Кружок Беларускае Народнае Асьветы**“. Закладзена яна была патайна ў Пецярбурзе з ініцыятывы трох асоб: Івана і Антона Луцкевічаў і Вацлава Іваноўскага—пад той час маладых студэнтаў. Арганізацыя здала сабе перадусім справу з таго, што, каб збудзіць народныя масы зо сну і адрадзіць нацыянальную культуру беларусаў, трэба даць народу кніжку і школу ў роднай мове. І вось гэтае заданьне яна паставіла перад сабой.

З ініцыятывы арганізацыі пачаўся збор грошы на выданьне твораў Янкі Лучыны (Няслухоўскага), сабраных у зборнічку „Вязанка“. Яна-ж прыступіла да выдаваньня невялічкіх альманахаў—„Вялікодная“ і „Калядная Пісанка“, якія выйшлі нелегальна (на „цыклёстылю“) ў 1903 годзе. А пасьля—яшчэ праз колькі гадоў — з ліку першых сяброў арганізацыі з Іваноўскім на чале заклалася ў Пецярбурзе выдавецкае таварыства „Загляне сонца і ў нашае ваконца“, а ў Вільні—з ініцыятывы братоў Луцкевічаў — пачалі сыстэматычна друкавацца беларускія кніжкі пад фірмай, закладзенай і ведзенай імі-ж „Нашае Нівы“, якая ў 1913 годзе перадала ўсю сваю маемасьць у кнігах і інш. новазакладзенаму і існуючаму дагэтуль Беларускаму Выдавецкаму Таварыству.

Але заслуга Кружка не абмежылася ініцыятывай у арганізацыі выдавецтва беларускіх кніжак. Кружок зрабіў першую спробу зацікавіць краёвую інтэлігенцыю справай беларускае школы. З гэтай мэтай была выпушчана перад Калядамі 1902 году гэктаграфаваная адозва з заклікам да шырэньня ў беларускай вёсцы асьветы праз школу ў роднай беларускай мове.

Тут трэба адзначыць, што арганізацыя зварачалася з сваім заклікам у першы чарод да краёвае інтэлігенцыі з польскай культурай. У гэтым часе польскае грамадзянства на Беларускай зямлі вяло шырокую акцыю па арганізацыі патайных польскіх школ. Вось-жа аўтары адозвы, надрукаванай на гэктаграфе папольску, і стараліся пераканаць польскіх культуртрэгераў у неабходнасьці перайсьці ў гэтай працы грамадзянства на беларускую мову—замест польскай, лічучы, што толькі асьвета ў роднай мове народу можа даць памысныя вынікі.—На жаль, у пачатку дваццатага сталецьця краёвая інтэлігенцыя з польскай культурай была ўжо цалком захоплена польскім нацыяналізмам і ня мела нічога супольнага з тымі настроямі, якія панавалі ў сярэдзіне XIX ст. сярод лепшых яе прадстаўнікоў у нашым краю. І адозва асталася—бяз водгуку...

Адозва гэта была першай і апошняй спробай нашых адраджэнцаў зварачацца да нашае спольшчанае інтэлігенцыі з заклікам да працы на ніве беларускай асьветы. Няўдача акцыі Кружка ў гэтым кірунку пераканала павадыроў яго, што толькі на свае ўласныя сілы—сілы захаваўшага сваю нацыянальнасьць беларускага працоўнага народу—трэба рахаваць і на іх будаваць усю беларускую справу. Аб звароце да польскае інтэлігенцыі асталася памяць толькі ў пастаці гумовае пячаткі з чатырма лацінскімі літарамі: K. B. O. L., якія азначаюць назоў Кружка ў польскай мове: „Koło Białoruskiej Oświaty Ludowej“. Пячатка гэта ставілася на адозвах і квітох на збор грошы, на якіх у касу арганізацыі з польскіх крыніц нічога не паступіла...

Падаючы гэтую жменю інфармацыяў аб першай нашай культурна-нацыянальнай арганізацыі, якая арганічна зьвязана з усім далейшым беларускім рухам, — мы хочам напомніць грамадзянству, што вось ужо дваццаць пяць гадоў трывае нясупынная работа над адраджэньнем нашага народу, — работа, якая дала такія багатыя, такія буйныя плёны. Думаем, што гэты юбілей заслугуе на ўвагу грамадзянства, што яно яго, як сьлед, ушануе.

А. Н.

„Мірны пачын Польшчы у Лізе Народаў“.

Як ведама, знамяніты Трактат у Лёкарно стварыў у Эўропе такое палажэньне: Нямеччына з усяго накіненага ёй гвалтам пераможцамі Вэрсальскага Трактату свабодна і дабравольна прызнала пэўную частку таго, што з ёй зрабілі ў рэзультаце яе паражэньня ў Вялікай Вайне.

Падобна да таго, як яна прызнала дабравольна пэўную частку „назначаных“ ей адшкадаваньняў, ці, проста кажучы, ваеннай кантрыбуцыі, прыняўшы „плян Даўса“,—таксама яна прызнала і загарантавала сама — сваім свабодным падпісам у Лёкарно—частку накіненых Вэрсальскім Трактатам граніцаў. А іменна: граніцы Заходнія—з Францыяй, Бэльгіяй і Люксэмбургам. Але рэшту сваіх граніцаў, створаных гвалтам мірнага трактату, Нямеччына ня прызнала аканчальнымі, абязаўшыся выразна ў Лёкарно толькі да таго, што ня будзе імкнуцца да іх зьмены шляхам тасаваньня ваеннага гвалту... Нямецкі ўрад зрабіў гэта на падставе прызнанага яму навет у Вэрсальскім Трактаце права. Бо ж Вэрсальскі Трактат дае магчымасьць пераглядзу—вядомым законным парадкам—граніцаў, якія з часам могуць зрабіцца немагчымымі да ўтрыманьня дый пагражаючымі вайной... Гэткімі граніцамі Нямеччына — вуснамі ўсіх бяз вынятку сваіх партыяў, не выключаючы навет „пацыфічных“ (міралюбных) сацыялдэмакратаў, — лічыць перадусім граніцы нямецка-польскія...

Трэба сказаць адкрыта, што Францыя, нарэзываючы шчодрай рукой Польшчы нямецкую зямлю, імкнулася пры гэтым ня гэтулькі да запраўднай карысьці ды спакойнага існаваньня Польшчы, скольскі—наадварот—да таго, каб запаліць назаўсёды агонь сьмяротнай узаемнай ненавісьці між палякамі і немцамі... Тады, думала Францыя, можна быць спакойнай, што Нямеччына — пад пагрозай вечнай вайны з Польшчай, ніколі сама першая ня кінецца на Францыю. Пры гэтым, францускія павадыры, твярцы „Вялікай Польшчы“ палаючы няўгаснай „сьвятой ненавісьцяй“ да Нямеччыны, ніколі не прадбачылі дый не маглі дапусьціць магчымасьці, каб Францыя магла калісьці зусім памірыцца ды паразумецца з Нямеччынай...

Што ж датычыць Расеі, дык у 1919 г. у Парыжу зусім не зварачалі ўвагі на яе існаваньне.—Думалі, што яна здолее „прысьці ізноў у Эўропу“, як пэўная сіла, толькі хіба праз паўвеку. Дык на месца былае царскае Расеі, „саюзьніцы Францыі“ і „сэрдэчнага прыяцеля“ Англіі, можна было—у акцыі проці Нямеччыны — стварыць і паставіць сільную Польшчу, якая аднача́сна адрэжа „ахоўным мурам і валам“—Расею ад Нямеччыны...

Як ведама, гэта ідэолёгія была добра распрацавана ў Парыжу ў часе міравой Канфэрэнцыі пераважна польскімі дэлегатамі — Дмоўскім і Падэрэўскім — і прыняла цалком усемагутнай францускай дэлегацыяй—напэракор Англіі...

Мы ня будзем паўтараць тутака, як многа вады ўплыло ад тых баечных часоў... Сьцьвердзім толькі, што ад таго часу вырасьлі аж тры неспадзяваныя вялізарныя факты паваеннай гісторыі.—Першы: Нямеччына адрадзілася з хуткасьцяй, якой ня было ў „плянах“ пераможцаў; другі—замест царскай Расеі, на Усходзе Эўропы стала ня Польшча, але магутны СССР; трэці—пад націскам захістаўшайся ў сваей магутнасьці Англіі — Францыя памірылася—паразумелася, як гаспадарча, таксама і палітычна—з Нямеччынай...

У выніку ўсяго гэтага аказалася, што ўся Вэрсальская Эўропа, пабудаваная на слабой Нямеччыне і слабой Расеі, але на сільнай Польшчы, неяк захісталася ў галоўных сваіх падставах... Польшча аказалася ў значнай меры пакіненай на свой небясьпечны ўласны лёс—між усё магутнеючымі вялікімі дзяржавамі: Нямеччынай і СССР. Утрымацца між імі, будучы прынцыповым, сьмяротным, вечным ворагам іх абедзьвюх (—каб гэтым „гарантаваць бясьпечнасьць Францыі“!), аказалася для Польшчы задачай, невырашымасьць якой кідаецца ў вочы навет дзецям...

У выніку ўсяго гэтага выясьнілася патрэба і канешнасьць для Польшчы перадусім вызваліцца з „залежнасьці ад Францыі“, якая сама першая „зволькіла Польшчу“ ад гэтай „залежнасьці“... Выясьнілася для Польшчы патрэба шукаць іншай вялікай дзяржавы — дзеля сваей аховы—за якую хочаш цану...

Гэткім палажэньнем справаў выклікаҡы быў той „пераварот“, які адразу паставіў Польшчу ў вялікую залежнасьць ад новай вялікай „апякункі“: ад Англіі. І Англія, праўда, адратавала Польшчу ад няўхільна-пагражаўшага ей фінансава-гаспадарчага банкруцтва, за якім,—як слушна ўжо спадзявалася Нямеччына,—наступіла-бы й палітычнае банкруцтва з цэлым радам няўхільных насьледзтваў ды з поўным пераглядам усяго новага тэрытарыяльнага ладу ў Эўропе...

Але сусьветныя адносіны — у выніку ўсё магутнеючага СССР—зложыліся так, што за гэту сваю „прыязьнь“ Англія патрэбавала ад Польшчы такой заплаты, якая для Польшчы зьяўлялася-б нябольш-няменш, як бясспрэчнай рызыкай сьмерці. Англія абяцала Польшчы сваю бязумоўную дапамогу ў-ва ўсіх галінах жыцьця — за тое, каб Польшча ўзяла на сябе пачын, павадырства і „першы агонь“ у тым „крыжавым паходзе“ проці СССР, які меў перадусім зьліквідаваць (у мэтах і інтарэсах Англіі!) яе сьмяротнага ворага ў Азіі, дый усюды, дзе толькі пануе

магутны англійскі імпэрыялізм, а гэта значыць—амаль не на ўсім сьвеце...

Здалёку новым валадаром Польшчы можа паказалася і лёгкай гэткая новая ваенная авантура, ня кажучы ўжо аб яе слаўнай рамантычнай велічы, так сільна гаворачай сэрцу іх галоўнага павадыра... Але, прыглядзеўшыся ды падлічыўшы сілы, і яны, ня гледзячы на бяскрытычнасьць іхняга „ваеннага рамантызму“, зразумелі ўсю недарэчнасьць ды рызыкоўнасьць вялізарнай, непасільнай для іх, самагубнай авантуры, падсуненай крывадушнай эгаістычнай Англіяй...

І вось, ізноў пайшло ахалоджаньне і другога „саюзьніка, прыяцеля ды ахоўцы“ Польшчы... З абяцанай Польшчы Англіяй... амэрыканскай пазыкі дасталіся пакуль-што толькі крышкі... Віды на далейшае —вельмі сумліўныя... У выніку ўсяго гэтага Польшча ізноў кінена сама сабе... Ізноў робіцца спроба, найцікаўнейшая — бо-ж, можна думаць, маючая вырашыць галоўнае палітычнае пытаньне пасьляваеннай Эўропы: ці здолее Польшча ўтрымацца ўласнымі ўнутранымі сіламі ў тым міжнародавым, міжсуседзкім палажэньні, якое створана для яе Вэрсальскім Трактатам і яе геаграфічнымі, гаспадарчымі, палітычнымі і іншымі ўнутранымі і вонкавымі кірункамі?! Ад вырашэньня гэтага пытаньня, як мы сказалі вышэй, залежыць самы быт такога ладу, які пануе ў Эўропе ад часоў міравога Трактату 1919 г...

Польшча папросту прымушана зрабіць гэтую спробу „самастойнай палітыкі“, прымушана зрабіць нейкі „пачын“ у шуканьні для сябе „крыніцаў міру“, як варунка для свайго існаваньня надалей...

Немцы заяўляюць ясна і выразна, што зусім і зараз-жа гатовы паразумецца з Польшчай, але—цаной пэўнага, пакуль-што, можа, ня значнага перагляду ўзаемных граніцаў...

Трэба думаць, што цьвярозая думка і воля павінны былі б падшапнуць Польшчы, каб згадзілася на гэты рашучы крок... Але „дзяржаўная амбіцыя“, перадусім, можа, рады з боку Францыі—не даюць ані на хвіліну польскаму розуму опыніцца на гэтым, у канцы канцоў няўхільным, кроку.

З другога боку, Польшча сама, — карыстаючыся заблутаным палажэньнем, канкурэнцыяй вялікіх дзяржаваў, хістаньнем узаемных адносінаў між Нямеччынай і ССРР,— прабуе дзеля забясьпечаньня свайго жыцьця яшчэ больш пэўнага шляху — паразуменьня з ССРР... Перагаворы, быццам, ізноў узнавіліся, быццам зроблены пэўныя, навет значныя пасьпехі... Але ізноў—не хапае ані розуму, ані сьмеласьці ў кіраўнікоў „наскрозь заходняй Польскай дзяржавы“ зрабіць і ў гэтым напрамку рашучы крок—да Усходу... Баяцца яны і гневу свайго сучаснага „пратэктара“, не парваўшага з Польшчай аканчальна і не адмовіўшагася яшчэ ад пакладаных на яе павадыроў надзеяў: Англіі...

Няма практычнага палітычнага розуму, няма ўсьцяж рашучасьці ды шчырасьці волі ў кіраўнікоў сучаснай Польшчы—ў абодвух галоўных напрамках яе беспасрэдняй практычнай палітыкі: ў заходнім і ўсходнім...

І вось на гэткім агульным псыхалягічным, палітычным і інш. фоне спарадзіўся так гучна цяпер рэклямаваны „польскі праект агульнага пакту аб загарантаваньні міру ў Эўропе“, „мірны пачын Польшчы ў Лізе Народаў“, які быццам захапіў „агульную ўвагу“ ў Лізе.

З усяго, што сказана вышэй, ясна згары, што ніякай рэальнай вартасьці і сілы ён мець ня можа і ня будзе... Ніякай паважнай вагі сама па сабе Польшча ў Эўропе дый у Лізе ня мае і ня можа мець.. Кіраўнікамі Лігі і Эўропэйскай палітыкі надалей астаюцца вялікія дзяржавы, у склад якіх увайшла ўжо, як сталы ды рашаючы чыньнік, Нямеччына. Польшча магла б мець значную вагу, калі-б яна рашуча выбрала той ці іншы напрамак магчымай для яе палітыкі, ці—калі-б яна рашуча ўвайшла ў тую — ці іншую групу дзяржаваў... Але цяпер, як сказана, яна—ізалявана (абасоблена), ці пакінена сваімі пратэктарамі, якія больш ад яе вымагаюць, чым самі ёй даюць... Дык „мірны пачын Польшчы“ трэба разглядаць, як і ў часы п. Скшыньскага, толькі чарговай „шляхотнай спробай пацыфістычнага красамоўства“, якая літэральна нічога ня зьменіць у рэальным укладзе сілаў у Эўропе... А ўжо найменш прычыніцца да забясьпечаньня ў ёй міру...

Як і слаўны Жэнэўскі Пратакол“, і гэтую новую спробу трэба разглядаць, можа—як новую, такую-ж сьмешную спробу зьвязаць папяровымі ніткамі азброеныя рукі вялікіх дзяржаваў... — Спробу, зрэшта, зусім зразумелую з боку тых дзяржаваў, якія чуюць добра, што яны — найслабейшыя, дык ніяк інакш—„у краіне вечнага міру“—ня здолеюць утрымаць тое, што здабыта, ці падаравана ім у выніку крывавай вайны...

Парыж. Кандратовіч.

З Лігі Народаў.

Спатканьне Штрэзэмана з Чэмбэрленам.

Адбылося спаткан. Чэмбэрлена з Штрэзэманам, на якім абгаворана справа дыскусіі ў Лізе над пытаньнем разбраеньня. Англійская і француская дэлегацыі „радзяць“ нямецкай не выступаць востра ў пытаньнях разбраеньня і вываду саюзных войск з Рэйнскіх правінцыяў Нямеччыны.

Сярод дэлегацыяў меншых дзяржаваў пануе вялікае незадаваленьне, якое пагражае выліцца на агульным сходзе, з прычыны зацягіваньня справы разбраеньня.

Чэмбэрлен проці польскага праекту.

Пасьля размовы з Штрэзэманам, яшчэ таго самага дня Чэмбэрлен прыняў прадстаўнікоў англійскай прэсы. На прыёме Чэмбэрлен гутарыў аб польскім праекце. Ён сказаў, што ня бачыць жаднай карысьці ў падпісаньні новага дакумэнту дзяржавамі, якія ўваходзяць у склад Лігі Народаў. Гарантыя бясьпечнасьці зьмяшчаецца-ж ужо ў пакце Лігі Народаў. Апрача таго, Лёкарно гарантуе ўсходнія і заходнія граніцы Нямеччыны. У гэтым дагаворы падпісаўшыя яго дзяржавы ўрачыста абяцалі не нападаць адна на адну. Чэмбэрлен ня можа зразумець, якую мэту маюць падобнага роду крокі Польшчы. Ён ня можа прыняць польскага праекту, бо ён бы паставіў пад сумліў вартасьць дасюлешніх дагавораў.

Як мы бачым, пасьля гутаркі з Штрэзэманам аб зьмесьце ягонага выступленьня Чэмбэрлен заняў выразную адмоўную пазыцыю адносна да польскага праекту. Гэта пацьвярджае думку, што гэты праект быў патрэбны і карысны Англіі, каб прымусіць Нямеччыну да ўступак у справе Рэйну — і толькі!

Як усталены быў аканчальны тэкст.

Польская дэлегацыя ўсталіла аканчальны тэкст пакту, які будзе прачытаны на агульным сходзе. Польская дэлегацыя ўвайшла ў зносіны з некаторымі дэлегацыямі, асабліва з англійскай, каб даведацца, у якой форме гэты праект будзе мець хоць да некаторай меры віды на пасьпех. Пачатковыя прапазыцыі Польшчы быццам значна зьмяніліся пры гэтым.

Далейшыя тэлеграмы паведамляюць, што аканчальны тэкст пасьля нарады польскага дэлегата Сокаля з членам французскай дэлегацыі Полем Беякурам усталены; тэкст гэты ўжо быццам разасланы ўсім дэлегацыям.

Далейшыя перагаворы.

„ПАТ“ паведамляе, што Сокаль адбыў у справе польскага праекту нарады з Чэмбэрленам і Брыянам, а пасьля і з Штрэзэманам. Гавас-жа (француское агенцтва) падае, што ў выніку перагавораў між кіраўнікамі дэлегацыі ўзьнімаецца магчымасьць, што польскі праект абернецца ў супольную дэклярацыю вялікіх дзяржаў. Спэцыялісты законьнікі французскай, англійскай, польскай, нямецкай і італьянскай дэлегацыяў разьбіралі падробнасьці польскага праекту, стараючыся ўсталіць тэкст гэткім спосабам, каб усе вышэйўспомненыя дзяржавы маглі-б з ім пагадзіцца.

Аб зьмесьце польскага праекту.

„ПАТ“ паведамляе, што польскі праект грунтуецца не на жэнэўскім пратаколе, але на леташняй рэзалюцыі Лігі Народаў, якая дамагаецца пашырэньня прынцыпу арбітражу. Апрача таго, Польшча дамагаецца абвяшчэньня зачэпнай вайны за праступленьне.

Швайцарскае Тэлеграфнае Агенцтва гэтак паведамляе аб зьмесьце польскага праекту:

„Праект, які ў працягу некалькіх дзён займае ўвагу ўсіх дэлегацыяў, мае форму простай заявы, зьмест якой наступны:

§ I. Усякая вайна, маючая на мэце вырашэньне міжнародавага канфлікту вайной, ёсьць і застаецца забароненай.

§ II. Усялякія міжнародавыя канфлікты павінны быць вырашаны пры дапамозе мірных сродкаў“.

Як відна з гэтага, польскі праект, зрабіўшыся непатрэбным для вялікіх дзяржаваў з прычыны паразуменьня з Нямеччынай, папросту ліквідуецца — і то не асабліва дэлікатна.

Урадавы камунікат аб польскім праекце.

Міністэрства заграничны спраў паведамляе.

Польская дэлегацыя на кангрэсе Лігі Народаў падасьць на разгляд кангрэсу агульныя ідэі пакту аб ненападаньні. Пакт гэты, якога форму трудна цяпер акрэсьліць, быў-бы далейшым удасканаленьнем пакту Лігі Народаў, які, як ведама, ня зусім выключае вайну з міжнародавых адносін. Агульны пакт ненападаньня быў-бы адкрытым для ўсіх членаў Лігі, а навет і для дзяржаў, якія не належаць да яе. Пакт гэты, рэч ясная, ня быў-бы скіраваны супраць нікога і меў-бы толькі на мэце ўгрунтаваньне ўзаемнага даверра між народамі, павялічэньне ўзаемнай бясьпечнасьці, і — што йдзе за гэтым — павялічэньне ўплываў і аўтарытэту Лігі Народаў.

„Маральнае разбраеньне“.

З гэткай пропаведзяй выступіў галяндзкі дэлегат. Ён даказываў, што перш, чым наступіць матэр'яльнае разбраеньне, трэба разброіцца спачатку маральна. Затым, трэба спыніць усялякую барацьбу на эканамічным полі. Дамагаўся яшчэ ён паўторнага разгляду асноў жэнэўскага пратаколу.

Запраўды, чытаючы гэта, весела робіцца Ну, і безгранічна ж наіўнасьць чалавека!

Кандыдатура Канады ў Раду Лігі.

Надзвычайна цікаўнай праявай упадку англійскай імпэрыі зьяўляецца выстаўленьне Канадай сваей кандыдатуры ў Раду Лігі Народаў. Дагэтуль Канада і іншыя „доміёні“ (складовыя часткі Брытанскай імпэры) ўваходзілі самастойна толькі як звычайныя члены Лігі Народаў. Цяпер-жа Канада дамагаецца для сябе мейсца ў Радзе Лігі Народаў нараўне з Англіяй і незалежна ад сваей „мэтраполіі“. Гэтак Англія траціць навет магчымасьць рэпрэзэнтаваць сваю доміню.

Кандыдатура Канады мае шансы на пасьпех. Гэткім чынам Канада пачынае выступаць на сусьветным палітычным форуме зусім, як незалежная ад Англіі самастойная адзінка.

Прэса аб польскім праекце.

Нямецкая і англійская прэса заховываюць свае ранейшыя адносіны да праекту. Нямецкая — у большасьці прост варожыя, а англійская — няпрыхільныя.

Француская прэса адносіцца да польскага праекту прыхільна.

Залатыя мысьлі марш. Пілсудскага.

Польшча перад уваскрасеньнем і Польшча пасьля ўваскрасеньня — гэта дзьве зусім розныя рэчы. За тое, у што верыла і што рабіла паняволеная Польшча—у адносінах да паняволіўшых яе чужацкіх дзяржаў, кепска прыходзіцца ў уваскрослай Польшчы паднявольным ёй народам, калі тыя хочуць тое-ж рабіць—у адносінах да яе...

Вось дзеля прыкладу жменя думак марш. Пілсудскага, якімі ён кіраваўся, калі вёў барацьбу за вызваленьне сваей бацькаўшчыны. Думкі гэтыя сабраў і пераказаў пасол на Сойм А. Ануш—на страніцах... паліцэйскае газэты „На Постэрунку“ (№ 45 — з 20. XI. 1926).

„Калі Пілсудскі, кіраваны ўчуцьцём і патрыятычнай думкай, пастанавіў служыць Бацькаўшчыне, — ён бачыў Бацькаўшчыну падзертай і паняволенай, а землякоў—папіханымі кулаком чужацкага салдата. Пілсудскі адразу-ж усьведаміў сабе, што паняволены народ можа вярнуць сабе волю і незалежнасьць толькі з аружжам у руках.

„Права на незалежны быт паняволены народ ня можа вышахраваць сабе, выпрасіць і вымабраваць: ён мусіць здабыць сабе яго крывёй і зялезам.

„Ніводзін захватчык самахоць ня выпусьціць ахвяры з сваіх кіпцяў, не захоча з ёй дагаварывацца, калі бяз ніякіх дагавораў можа яе эксплёатаваць і абдзіраць.

„Чаму існуе няволя? Бо існуюць нявольнікі, якія годзяцца на няволю. Калі нявольнік у душы сваей пачуе сябе вольным, пераможа страх перад тыранам і пастановіць скінуць ярмо,—дык дні няволі палічаны!“

„Хто мае вушы, каб слухаць, — хай чуе!“—дадамо да гэтых запраўды-ж залатых мысьляў марш. Пілсудскага — словы Эвангельля....

Ці так думае марш. Пілсудскі і цяпер— пасьля ўваскрасеньня Польшчы, гэта вельмі сумліўна.

Сэрвітуты.

(Гл. № 41 „Нашае Праўды“).

ЧАСЬЦЬ II я.

Касаваньне сэрвітутаў паводле дабравольных дагавораў.

Пункт 14. Паводле дабравольнага дагавору могуць быць касаваны цэлком або часьцінамі сэрвітуты, належныя асобным гаспадаркам, групам такіх гаспадарак ці ўсім гаспадаркам вёскі.

П. 15. Часьціна зямлі, належная за сэрвітут групе гаспадарак, ці ўсім гаспадаркам аднэй вёскі, мусіць выдзяляцца на супольную іх уласнасьць.

П. 16. Калі-б за касаваны сэрвітут сялянам аддзялілі зямлю, на каторай сядзяць дробныя арандатары, якія знаходзяцца пад апекай закону з 31 ліпня 1924 г аб ахове дробных арандатараў (Dz. U. R. P. № 75, poz. 741), дык уласьнік двара (пан) мусіць даць дробным арандатарам у замену другія дзялянкі такой самай вартасьці і за плату, якую яны плацілі за гэтай пары на падставе сказанага закону з 31.VII—1924 г. Гэтыя арандатары на трэбаваньню павятовага земскага ўраду мусяць уступіць з дасюлешніх дзялянак і ўзяць у арэнднае карыстаньне вызначаныя ім новыя дзялянкі.

Пры гэтым пункце лічым патрэбным паясьніць: за дробных арандатараў закон з 31 ліпня 1924 г. „аб ахове дробных арандатараў“ лічыць такіх, каторыя маюць у арэндзе ня больш 8 гэктараў дворнай зямлі і ня менш, як на 6 гадоў.

Вось, калі-б значыць пан аддаў арандаваныя дзялянкі за сэрвітут, дробныя арандатары павінны зажадаць ад пана новых дзялянак такога-ж абшару і вартасьці і за такую-ж самую арэнду.

П. 17. Пры дабравольным касаваньні сэрвітутаў — з панскага боку, калі двор падзелены, мусяць падпісваць дагавор прадстаўнікі тых частак двара з каторых зямлю для сялян за сэрвітут выдзялілі.

П. 18. 1. За касаваныя сэрвітуты сялянам можна выдзяліць лес ці зямлю пад лесам толькі тады, калі адносны ўрад аховы лясоў пасьведчыць, што яны (выдзелены лес ці зямля пад лесам) ня маюць ахоўнай вартасьці. Непатрэба такога пасьведчаньня тады, калі выдзяляецца сялянам за сэрвітут ня больш, як 20% прац. абшару ўсіх лясоў і зямлі пад лесам у цэлым двары.

2. На вырубку лесу і абработку пасекі патрэбны дзеля важнасьці дагавору дазвол адноснага ўраду аховы лясоў. Дазвол гэтакі мусіць быць дадзены, калі зямля пад лесам прыгодна дзеля абработкі пад ральлю.

3. Калі зацікаўленая старана зьвернецца да адноснага ўраду аховы лясоў з пытаньнем у справе ахоўнай вартасьці зямлі, якая мае быць выдзелена сялянам за сэрвітут, або папросіць дазволу на вырубку лесу і абработку пасекі, і калі ў працягу 30 дзён ад атрыманьня паданьня ўлада ня дасьць адмоўнага адказу, што мусіць гэта ўлада пасьведчыць, то трэба лічыць, што паданьне разгледжана прыхільна і дазвол дадзены.

4. Калі староны не даставяць такіх дазволаў разам з дагаворам, то павятовы земскі ўрад зьвернецца да адноснае ўлады па ахове лясоў, каторая ў працягу 30 дзён ад атрыманьня запытаньня мусіць паведаміць павятовы земскі ўрад аб сваім рашэньні. Калі ў вызначаны тэрмін рашэньне ня будзе прыслана, земскія ўрады могуць прызнаць, што лес і зямля пад ім ня маюць ахоўнай вартасьці, і што жаданы дазвол дадзены.

Увага аўтара: Пад словам „адносны“ трэба разумець урад таго павету і ваяводзтва, у каторым ляжыць сэрвітутная зямля. Ахоўная вартасьць лесу і зямлі пад лесам залежыць перш-на-перш ад кліматычных абставінаў і якасьці грунту.

П. 19. 1. Дагаворы аб скасаваньні сэрвітутаў трэба рабіць у натарыуса, або прыватна ў прысутнасьці ня менш, як двух сьведак, незаінтарэсаных у скасаваньні гэтых сэрвітутаў. Подпісы мусяць быць пасьведчаны натарыусам, гміннай або дзяржаўнай адміністрацыйнай уладай (староства ці ваяводзтва). Кожная старана мае права падаць да павятовага земскага ўраду дагавор або пасьведчаную копію з яго і жадаць зацьверджаньня дагавору і выпаўненьня.

2. Дагаворы важны і вяжуць абедзьве староны ад хвіліны іх падпісаньня. Дагаворы, каторыя не зацьвердзяць земскія ўрады, лічацца разьвязанымі законам.

П. 20. 1. Акружная Земская Камісія адмовіць зацьверджаньня дагавору толькі ў адным з наступных выпадкаў:

а) калі дагавор будзе нязгодны з гэтым загадам ці іншымі законамі;

б) калі выдзялілі сялянам за сэрвітут зямлю, за ўладаньне якое йдзе суд;

в) калі дагавор ня ясны — граніцы выдзеленай сялянам зямлі не абазначаны, або з лішне вялікага абшару выдзеленага сялянам за сэрвітут зямлі, урад дагледзіць, што дагавор фікцыйны,

г) калі ўвядзеньне ў жыцьцё дагавору зробіць немагчымым папраўленьне сельскай гаспадаркі, увядзе яшчэ большую шахаўніцу, або калі некатарыя з выдзеленых сялянам палетках ня мелі-бы неабходнага даезду.

2. Калі на жаданьне зацікаўленай стараны (г. зн. сялян або пана) Акружная Земская Камісія прызнае, што некатарым сялянам выдзелена за-шмат зямлі з крыўдай для іншых сялян, то мае права зацьвердзіць дагавор так, што ўся выдзеленая за сэрвітут зямля будзе супольнай уласнасьцяй усіх гаспадарак, якія маюць сэрвітут.

3. Зацьвярджаючы дагаворы, Акружная Земская Камісія абяжа старону, якая згодна з дагаворам — мусіць аплаціць кошт зямлямерных дакумэнтаў, — калі ў дагаворы гэта не паказана, то абедзьве староны, каб прынамся ў 3-х месячны срок даставілі гэтыя дакуманты да Акружнага Земскага Ураду.

П. 21. 1. Калі да часу атрыманьня дагавору Акружнай Земскай Камісіяй ніводная з зацікаўленых старон не падасьць пратэсту, то камісія разгледзіць справу на зачыненым паседжаньні.

2. Калі ў срок, прадбачаны ў пункце 13, Акружная Земская Камісія ня выдасьць рашэньня, то прызнаецца, што дагавор зацьверджаны.

Вось, гэтым пунктам канчаецца часьціна загаду (закону), што датычыць дабравольнага (шляхам дабравольных дагавораў) касаваньня сэрвітутаў. Сяляне, якія маюць сэрвітут, могуць ісьці на дабравольнае касаваньне толькі тады, калі іншага выхаду няма: цяжка дастаць усе дакумэнты, пан заўсёды судзіцца і ўсьцяж жадае падзелу і калі дае сялянам за сэрвітут добры кавалак (прынамся палову) сэрвітутнага абшару ў здатным да абработкі месцы.

Дробныя арандатары мусяць пры тым сачыць, каб ня страціць сваіх правоў: калі арандаваную імі зямлю выдзяляюць за сэрвітут, яны павінны жадаць ад пана новых, такіх самых дзялянак і ня ўступаць датуль, пакуль ім новых дзялянак за такую самую арэнду пан ня дасьць.

Важна гэта часьціна (п. 19) і для тых вёсак, што дагаварыліся ў справе скасаваньня сэрвітутаў даўней, калі яшчэ ніхто ня ведаў, што Заходняя Беларусь будзе пад Польшчай. Як бальшавікі йшлі пад Варшаву, усе паны былі мякчэйшыя і многія з іх навет бяз лішне фармальных дакумэнтаў прызнавалі сялянам сэрвітут і гадзіліся на выгадны для сялян падзел яго. Цяпер, пачуўшы сябе ізноў бясьпечнымі, паны адракаюцца ад гэных дагавораў, кажучы, што яны не пасьведчаны натарыусам. Вось п. 19 і гавора, што ўсе, навет прыватна запісаныя дагаворы, маюць сілу, і сяляне могуць судовым шляхам даходзіць іх выпаўненьня. Трэба толькі, каб подпісы былі пасьведчаны хоць гмінай.

Янка Жыжмянскі.

Зьмярканьне Англіі.

II.

Гэтак налажэньне англійскага гандлю ў пасьляваенныя часы надзвычайна пагоршала. Гэта бязумоўна вельмі крэпка ўдарыла па ўсім эканамічным жыцьці Англіі, выклікаючы застой англійскай прамысловасьці і хранічнае, нябывалае дагэтуль па сваім разьмерам безрабоцьце. Але ў гэтым артыкуле нас ня цікавяць унутраныя насьледкі для Англіі гэтага зьявішча. Нас цікавіць перадусім тое, як адбіўся і адбіваецца гэты працэс на зьмяншэньні міжнародавага эканамічнага і фінансавага значэньня і вагі Англіі.

Як мы ўжо вышэй успомнілі, яшчэ да вайны англійскі таргові баланс даваў дэфіцыт. Гэты дэфіцыт з лішкам пакрываўся даходамі англійскага таргавага флёту. Гэткім чынам у руках Англіі заставаліся 3 з лішкам міліярды рублёў даходаў ад заграмічных прадпрыемстваў і пазычак.

Дзякуючы гэтым аграмадным капіталам і таннасьці крэдыту, англійскія капіталісты ня толькі ўтрымлівалі за сваей прамысловасьцю яе старыя рынкі, але, дзякуючы новым капітальным укладам за граніцу, дзякуючы новым пазыкам, ствралі новыя рынкі для сваей прамысловасьці, раўнуючы з іншымі, як напрыклад з нямецкай, ужо адсталай. Да вайны Лёндан быў сусьветным банкірам. Гэтае сусьветнае банкірства рабіла Англію найбольш уплывовай палітычнай дзяржавай. Яе эканамічная і фінансавая моц была падставай яе палітычнай і мілітарнай магутнасьці. Яна зрабіла яе каралевай мораў і акіянаў. Сваімі мільярднымі пазыкамі лёнданская біржа, а перадусім Англійскі Банк узалежнялі ад сябе дзяржавы ўсяго сьвету— не раўнуючы, як цяпер Амэрыка.

Грошы кіруюць сьветам, кажа нямецкая прыгаворка. Але цяпер гэтаму панаваньню Англіі прыходзе канец. Як мы пабачым, яна прымушана ўжо клапаціцца, каб захаваць фінансавую залежнасьць ад сябе навет сваіх калёніяў; мала таго: ей самой пачынае пагражаць фінансавая, а праз гэта—эканамічная і палітычная залежнасьць. Дзякуючы упадку англійскага міжнародавага гандлю, дэфіцыт у тарговым балянсе Англіі дасягнуў такой вышыні, што на пакрыцьце яго ня толькі не хапае даходаў ад таргавага флёту, але зьядаюцца амаль ня ўсе яе даходы ад заграмічных прадпрыемстваў і пазык. У 1925 г., а знача перад вугальнай забастоўкай, у нармальны год (!), таргові дэфіцыт Англіі дасягнуў вышыні блізу 2 міліярдаў даляраў, зьеўшы ўсе яе вышэй успомненыя даходы.

З вялікай нацяжкай англійская афіцыяльная статыстыка налічае яшчэ каля 150 мільёнаў даляраў чыстага прыбытку, які астаўся пасьля пакрыцьця таргоВага дэфіцыту 1925 г. Гэтая сума раўняецца блізу 10 працэнтам даваенных даходаў. Лепшага выражэньня, як у гэтай лічбе, працэс зьмярканьня Англіі, на наш пагляд, знайсьці ня можа.

Англія, як мы бачым, ужо ня мае больш свабодных капіталаў. Тыя новыя пазыкі, якія яна дае, даюцца коштам прадажы старых цэннасьцяў, бо інакш няма скуль узяць. (З неба грошы на пазыкі хіба-ж ня зваляцца).

Апошнімі часамі Аўстралія пазычыла ў Амэрыкі 40 мільёнаў даляраў. А пазычка Аўстраліі, зробленая ў Англіі на тых-жа самых варунках, неўдалася: яна пакрыта толькі на... 11 процантаў! Сьледам за Канадай, Аўстралія пераходзе ў фінансавую залежнасьць ад Амэрыкі.

Гэткім чынам, як сусьветны банкір, Лёндан страціў сваё даўнейшае значэньне. Ен зрабіўся проста сусьветным менавым пасрэднікам, гдзе прадаюцца адны пазыкі і акцыі, каб купіць іншыя. З сусьветнага банкіра і грашовага волата, з уласнымі сьвежымі капіталамі Лёндан абярнуўся ў мяняльную кантору. Англія страціла здольнасьць здаволіваць фінансавыя патрэбы нават і сваіх калёніяў.

Аднак, ня толькі прадажай старых цэннасьцяў здрбывае Англія сабе грошы на новыя пазыкі і акцыі. Яшчэ адзін спосаб практыкуюць англійскія банкі. Атрыманыя з краткасрочных пазык грошы яны зьмяшчаюць у даўгасрочныя займы. Праўда, і раней, перад вайной, яны рабілі гэта. Аднак, тады былі іншыя часы і варункі: тады каля 3 мільярдаў рублёў прыцякала ў Ангію сьвежых капіталаў.

Доўга гэтак не паскачаш. Вось, у што абярнуўся цяпер магутны, незалежны лёнданскі банкір, аб ласку якога стараліся дзяржавы сьвету.

Аднак, пяройдзем да далейшага аналізу (разбору) прычын упадку англійскага капіталізму,—прычын, якія не залежаць ад прыродных засобаў і сіл Англіі. (Гэта будзе высьветлена ў асобным артыкуле). Замест таго, каб перад вайной, бачучы адставаньне ў разьвіцьці свайго гандлю ад іншых, зрэарганізаваць сваю адсталую прамысловасьць, зрэарганізаваць новымі спосабамі, на новы лад свой вытворчы апарат і гэткім чынам захаваць сваё пяршынства ў змаганьні з Нямеччынай панаваньне на сусьветным рынку,—кіраўнікі англійскай эканомікі, яе банкіры, аніраючыся на эканамічную, фінансавую і палітычную сваю перавагу, рашылі бяз доўгай працы і стараньняў проста зьнішчыць свайго канкурэнта вайной. Мы ведаем, аднак, чым гэта кончылася для іх з папярэдніх табліц і лічб. Але гэтая вайна мела і яшчэ іншыя, ня менш згубныя для англійскага капіталізма вынікі.

Гэтыя вынікі—ваенныя даўгі. Вось, для прыраўнаньня жменя лічб, якая характэрызуе фінансавае палажэньне дзяржавы англійскіх капіталістаў. Да вайны дзяржаўныя даўгі па даўгасрочным пазыкам раўняліся 588 мільёнам фунтаў (блізу 5 міліярдаў 880 мільёнаў рублёў золатам); даўгасрочных дзяржаўных вэксалёў было на 20 мільёнаў фунтаў (блізу 200 міл. руб. золатам) і кароткасрочных—на 30 мільёнаў фунтаў (300 міл. руб. золатам), ды казначэйскіх білетаў на 15 міл. фунт. (150 міл. руб.). Пасьля-ж вайны даўгасрочныя пазыкі раўняюцца 76 мільярдам руб. у золаце, даўгасрочныя вэксалі — 454 мільён. фунт. (4 міліярды 540 міл. руб.), кароткасрочныя—616 мільён. фунт. (6 мільярдаў 160 міл. руб.), казначэйскія білеты — 15 мільён. ф. (150 мільён. руб.). Да гэтага трэба дадаць 113 мільён. фунтаў (1 мільярд 130 мільён. руб.) дзяржаўных авансаў. Як мы з гэтага бачым, кароткасрочныя дзяржаўныя даўгі перавышаюць з лішкам увесь даваенны доўг Англіі, ня кажучы ўжо аб проста астранамічнай вышыні ўсяго дзяржаўнага даўгу. Дорага-ж заплацілі! Вось, гэтыя кароткасрочныя дзяржаўныя даўгі, перавышаючыя ўвесь даваенны дзяржаўны доўг, і зьяўляюцца ў сучаснасьці адным з праклянцьцяў у эканамічным жыцьці Англіі.

Англійская прамысловасьць за гэты час адстала значна ня толькі арганізацыйна, але і тэхнічна. Дзеля таго, каб перабудаваць яе, зрабіць яе здольнай да далейшай барацьбы за рынкі, каб яна хоць у далейшым ня траціла сваіх пазыцыяў на сусьветным рынку, патрэбны значныя грошы, патрэбны ўжо мільярды. З сваіх прыбыткаў сучасная англійская гаспадарка іх ужо дастаць ня можа. Патрэбны пазыкі.

У Англіі, якая дагэтуль пазычала грошы іншым, працэнтныя стаўкі нізкія. Восьжа, каб зрабіць магчымым дапльгў значных чужаземных капіталаў—ужо у Англію, трэба павялічыць гэтыя працэнтныя стаўкі. Гэта-ж ідзе ў разрэз з інтарэсамі англійскага дзяржаўнага скарбу. Англійскі скарб, імкнучыся абярнуць свае вялізарныя кароткасрочныя з'абавязаньні ў даўгасрочныя пазыкі, ня можа згадзіцца на гэтае павышэньне пад пагрозай перагрузіць бюджэт дзяржавы працэнтнымі сплатамі,—гэткім чынам англійскія дзяржаўныя даўгі робяцца перашкодай для прыплыву капіталу, неабходнага для рэарганізацыі англійскай прамысловасьці. Яны не рашкаджаюць станучь на новы тэхнічны і арганізацыйны грунт англійскай прамысловасьці, ды гэткім чынам ня то, што адваяваць пяршынства (аб гэтым няма ўжо гутаркі), а і захаваць хоць-бы ад далейшага заняпаду англійскую гаспадарку. Гэткія труднасьці ўзьнімаюцца цяпер для англійскага капіталізма ўжо навет і на гэтым шляху.

Неабходнае ж зьніжэньне цэн, каб ня траціць далей рынку, і неабходныя на рэарганізацыю прамысловасьці грошы англійская буржуазія рашыла ў гэтых варунках спагнаць з рабочых. Першы ўдар па сваёму заработку атрымалі гарнякі, якія адказалі забастоўкай, якой ня бачыў яшчэ сьвет. Вынікам яе быў далейшы фінансавы і эканамічны ўдар па англійскай гаспадарцы.

Вось, у кароткіх рысах — прычыны і абраз зьмярканьня Англіі, зьмярканьня яе, як сусьветнага волата.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Сойм будзе склікан.

Як ведама, апошняя сэсія Сойму была неўспадзеўкі спынена ўрадам, калі Сойм маніўся правясьці законы, спрэчныя з пагалядамі ўраду. Пасьля гэтага, згодна з забясьпечачым канстытуцыяй правам, паслы Сойму ў прадбачаным канстытуцыяй ліку падалі прэзыдэнту Рэспублікі заяву, дамагаючыся склікаьня новае сэсіі Сойму.

На гэтай падставе прэзыдэнт загадаў склікаць Сойм на звычайную сэсію на 13 гэтага верасьня.

Блізкі да ўраду „Кур. Віл." падае вестку, што лёс і гэтае сэсіі і Сойму наагул залежны будзе ад таго, чым Сойм будзе займацца. Калі Сойм будзе настаіваць і далей на сваім праве самараспусканьня, на што ўрад не згаджаецца, дык трэба спадзявацца, што ўрад ня скліча бюджэтнае сэсіі, а пачакае, каб у лістападзе мандаты сучаснага складу паслоў скончыліся самі сабой, а тады будуць вызначаны новыя выбары.

Можам толькі пажадаць, каб гэта сталася чым хутчэй!

Прысуд над генаралам хабарнікам.

Ваенна-акружны суд у Варшаве засудзіў генарала Жымерскага на 5 гадоў цяжкога вастрогу з пазбаўленьнем вайсковага стану і выдаленьнем з арміі—за надужыцьці і шкоды, зробленыя дзяржаўнаму скарбу. Генарал Жымерскі, займаючы высокае становішча ў польскім войску, даваў заказы аблюбаваным ім фабрыкам—за хабары—па цане, якая шмат перавышала запраўдную вартасьць заказаных прадметаў. Гэтак пры заказе адных толькі проціґазавых масак пераплачана было фабрыцы лішніх 150,000 даляраў.

Суд прызнаў, што ген. Жымерскі дзеяў з поўнай сьвядомасьцяй, хаця да злачынстваў яго скланілі іншыя асобы, як павадыр НПР (партыя работнікаў нацыяналістаў — арганізацыя эндэцкага кірунку), пасол Сойму Попель, ды іншыя.

Таргуюць сваей бацькаўшчынай...

„Rzeczpospolita" падае гэткую вестку з Торуня (крэпасьць недалёка ад нямецкае граніцы).

Уначы з пятніцы на суботу, 3 верасьня, вайсковыя сьледчыя ўлады заарыштавалі паручніка артылерыі Язэпа Копалю, які займаўся шпіёнствам на карысьць Нямеччыны. Копаля акурат зьбіраўся ўцячы заграніцу, калі яго схапілі. Копалю будзе судзіць даразны суд. Яму паграҗае кара сьмерці.

Сярод украінцаў.

Падобна, як у беларусаў, у ўкраінскім пасольскім клюбе выяўляецца ідэйны раскол на груньце адносінаў да Польшчы. Паслы з сялянска-работніцкай ідэалёгіяй („Сельроб"), некаторыя нацыяналісты-незалежнікі, ды навет такі царкоўнік, як сэнатар Пастэрнак, — лічаць, што ўкраінскі клюб, прэзыдыум якога знаходзіцца ў руках нацыяналістаў, вядзе згодніцкую палітыку ў адносінах да польскага ўраду. Сярод пералічаных групаў узьнялася думка аб неабходнасьці перагледзець клюбовую палітыку і выбраць новы прэзыдыум. Вось, апазыцыя і патрэбавала ад прэзыдыуму склікаьня агульнага сабраньня клюбу, каб падняць гэтыя пытаньні. Да апазыцыі належаць паслы: Чучмай, Підгірскі, Маківка, Казіцкі, Братунь, ды ўспомнены сэнатар Пастэрнак.

Заграніцай.

За Сакко і Ванцэтті.

У Нью-Іорку ў гмаху найвышэйшага трыбуналу Злучаных Штатаў кінена бомба. Гмах трыбуналу і суседнія дамы крэпка пацярпелі.

Трайковіч і Павлюкевіч.

Вельмі характэрнай і паказальнай зьяўляецца тая сувязь, якая—пэўне-ж не прыпадкова!—існуе паміж пакушэньнямі на жыцьцё радавых дыпляматычных прадстаўнікоў і „тоже бѣлоруссомъ" (ён-жа „полёнофіл"!) — „доктарам" Павлюкевічам.

Справа Кавэрды першая выявіла гэту сувязь. Кавэрда быў давераным чалавекам Павлюкевіча, быў яго „верным сабакам", гатовым зрабіць ўсё, што загадае гаспадар, не аглядаючыся нае тое, ці трэба йсьці чыстым, ці ня чыстым шляхам. А вось, цяпер выясьняецца, што і каля асобы Трайковіча стаіць недзе вельмі, вельмі блізка... той-жа „доктар" Павлюкевіч!

Мы атрымалі гэткую цікаўную інфармацыю.

У пачатку выбарнае акцыі ў Віленскі мястовы самаўрад група „чыстых" расейскіх манархістаў пачала выдаваць свой лісток пад назовам „Злотый". Лісток гэны друкаваўся сьпярша ў друкарні Баеўскага, а пасьля — Бэккера (вул. Субоч 2). Весь-жа рэдакцыя „Злотага" пачала дужа блага пісаць аб павлюкевічавай „Беларускай Хатцы" (ведамым ігорным доме пад фірмай „беларускай", з даходаў з гэтай установы кормяцца ўсе кумпаны Павлюкевіча).

І вось у адзін некны дзень сьпярша ў друкарню Баеўскага, а пасьля — да Бэккера (сюды ўжо лісток гэны быў перанесены) зьявіўся Трайковіч яшчэ з нейкім тыпам—абодва п'яныя, ды патрэбаваў рэдактара „Злотага", каб яму „морду побить" за... „Беларускую Хатку"! Калі ж рэдактара не аказалася, дык абодва „абаронцы чэсьці" павлюкевічавага прадпрыемства хацелі параскідаць шрыфты і набор „Злотага", і толькі пакліканая паліцыя вывела з друкарні буянаў.

З гэтага ясна, што Трайковіч быў з нейкае прычыны асабліва заінтэрэсаваны „гонарам" Павлюкевіча — і пры тым асабістым „гонарам" яго, бо—як расеец па сваім перакананьням — ня мог-жа ён ісьці на скандал у імя „беларускасьці" ігорнага дому пад фірмай „Беларуская Хатка".

Акалічнасьць гэта—вельмі цікаўная для ўсяе справы новага пакушэньня на радавага дыпляматычнага прадстаўніка ў Варшаве, каторы, як ведама, акурат аказаўся па нацыянальнасьці беларусам....

Трэбуйце адказу!

Да грамадзян і паўнамоцнікаў, склаўшых дэкляцацыі на ўрадавыя беларускія школы на 1927/28 школьны год.

У сувязі з распараджэньнем міністра Рэлігійных Спраў і Публічнае Асьветы з 7/I 1925 г. на падставе ўставу аб арганізацыі беларускага школьніцтва з 31./VII. 1924 г., школьны інспэктар, разглядзеўшы дэкляарацыі не пазней 31-га траўня (мая), робіць сваё заключэньне і з усімі матар'яламі справу перадае Куратару. На падставе дадзеных інспэктарам прапазіцыяй, куратар у працягу месяца рашае аб мове навучаньня ў тэй ці іншай школе і аб сваім рашэньні праз абвестку паведамляе заінтарасаваную люднасьць. Апроч таго, аб сваім рашэньні Куратар паведамляе аднаго з тых бацькоў, якія жадаюць навучаньня сваіх дзьцей у беларускай мове, і аднаго з тых, якія жадаюць навучаньня сваіх дзяцей у польскай мове.

Пастанову Куратара бацькі могуць абжалаваць да Міністра Асьветы ў працягу 14 дзён ад дня паведамленьня праз абвестку.

Усе грамадзяне і паўнамоцнікі школьных абводаў, склаўшыя дэкляарацыі на ўрадовую беларускую школу на 1927/28 школьны год, павінны дамагацца праз школьных інспэктароў пастаноў Куратара (калі Куратар сам не паведаміў) у справе арганізацыі беларускіх урадовых школаў на 1927/28 школьны год.

Пажадана было-б, каб паўнамоцнікі школьных абводаў, а там, гдзе паўнамоцнікаў няма, то бацькі ў ліку двух даведаліся-б у вышэйсказанай справе ў мясцовага школьнага інспэктара асабіста, але, калі значная адлегласьць школьных абводаў ад мясцовых школьных інспэктаратаў гэтаму перашкаджала-б, то хай зварочваюцца пісьменна (заказнымі пісьмамі) з цьвёрдым дамаганьнем пастановы Куратара ў справе адчыненьня беларускіх урадавых школаў на 1927/1928 школьны год.

Увага: Пад словамі: „школьны абвод" разумеюцца бліжэйшыя вёскі, якія зложылі дэкляарацыі агулам на 40 дзяцей. Таксама будзе лічыцца школьным абводам і I вёска, сяляне якой зложылі дэкляарацыі на 40 дзяцей.

Галоўная Управа
Таварыства Беларускае Школы
Вільня, сьв.-Ганны 2—3.

ХРОНІКА.

Дзіўнае абвіненьне. Як інфармуе „Kur. Wil.", камісарыят ураду на м. Вільню цягне да судовае адказнасьці нашу газэту за зьмяшчэньне ў апошнім нумары „вострае і нязгоднае з рэальнымі падставамі крытыкі палітыкі ўраду ў адносінах да беларускага школьніцтва на Усходніх Крэсах".

Калі гэта праўда, дык прынамся будзем мець магчымасьць даказаць на судзе ўсё тое, што мы пісалі аб школьнай палітыцы ўраду. Дзівіць нас толькі тое, што камісарыят ураду ня ведае фактаў, якія ведамы, здаецца, абсалютна кожнаму, хто цікавіцца беларускім жыцьцём. Найлепшым-жа сьведкай нашым будзе... пан К. Сроковскі, аўтар вельмі цікаўнае кніжачкі аб беларускай справе, напісанай на падставе асабістых досьледаў аўтара, зробленых у свой часе... з даручэньня ўраду і не сканфіскаванай цэнзурай.

Дый паміма таго фактаў і дакумэнтаў шукаць ня прыдзецца!

Выбары ў самаўрады—і вайсковыя. Ваеннае міністэрства выясьніла, што ў межах ваяводзтваў Наваградзкага, Віленскага, Валынскага і Палескага, а так-жа ў Ваўкавыскім і Горадзенскім паветах, Беластоцкага ваяводзтва, згодна з абязываючым тут распараджэньнем генаральнага камісара Усходніх Зямель з 25-га чэрвеня 1919 году, **вайсковыя асобы на чыннай службе ня могуць прымаць учасьця ў выбарах у самаўрады.**

„Родныя Гоні". Пасьля месячнага летняга перарыву пачала ўжо друкавацца чарговая—пятая—кніжка журналу „Родныя Гоні", Кніжка хутка выйдзе з друку.

Спэктакль-вечарына — адчыненьне зімняга сэзону. У суботу 10-га верасьня 1927 г. Тэатральная Сэкцыя Навасьвецкага Гуртка Т-ва Белар. Школы ладзе спэктакль-вечарыну ў памешканьні Цэнтр. Гуртка Т-ва Бел. Школы (вул. Сьв.-Ганны 2 — 3), гдзе будзе сыграна на сцэне: 1) дзьве камэдыі, 2) дэклямацыі, 3) струнны аркестр, 4) скокі—пад духавы аркестр, 5) лятучая пошта, 6) буфэт.

Пачатак у 8 гадз. увечары. Уваход па запросінах.

З жыцьця Горадні.

× **Перад выбарамі.** Міністэрства Унутр. Спраў праз Беластоцкае ваяводзтва распусьціла мястовую Раду (магістрат) у м. Горадні. Гэта кажа аб тым, што мы знаходзімся на пярэдадні выбараў новае Рады.

Усе сьвядомыя працоўныя беларусы м. Горадні павінны да гэтага пытаньня падыйсьці вельмі сур'ёзна і падумаць аб тым, з кім ісьці: самастойна ці з блёкам работнікаў другіх нацыянальнасьцяў? Даць параду ў гэтым напрамку пакуль-што вельмі цяжка, няведама, якія могуць злажыцца абставіны. Адно толькі пакуль-што трэба добра памятаць, каб выбарчая акцыя ня была барацьбою за мандаты, а каб мела мэтаю палепшаньне жыцьця, а дзеля гэтага на кандыдатаў у радныя трэба вызначыць людзей сумленных, якія выйшлі з вашых радаў, якія

нікол і ня здрадзяць вашых інтарэсаў. Адно трэба помніць, што горадзенскія беларускія кандыдаты ў радныя будуць трымацца тае плятформы, якую выказалі і віленскія беларускія работнікі ў часе астатніх выбараў, а іменна:

1) За поўнае звальненьне працоўнай бедналы ад усіх падаткаў, а абкладаньне імі клясы заможнай.

2) За перадачу на ўласнасьць гораду ўсіх фабрыкаў і заводаў, які беспасярэдна працуюць для патрэбы мяйсцовай людцасьці; за работніцкі кантроль у-ва ўсіх галінах грамадзкай дзейнасьці.

3) Проці дарагоўлі праз забарону вывазу спажывецкіх прадуктаў за межы Зах. Беларусі.

4) За дапамогу з боку мястовае Рады работніцка-сялянскім культурна-асьветным арганізацыям і каапэратывам.

5) За ўдзяленьне крэдыту дробным рамесьнікам і работнікам.

6) За поўнае раўнапраўленьне ўсіх нацыянальнасьцяў, за дапушчэньне беларусаў да ўрадаў; за ўрадаваньне на ўсіх мяйсцовых мовах.

7) За родную школу і дармовае навучаньне ў сярэдніх і вышэйшых школах дзяцей работнікаў.

8) Проці выдаткаў на карысьць духавенства.

9) За дапамогу безработным праз удзяленьне дзяржаўнай запамогі—поўнага заработку ўсім пазбаўленым працы. Скрэсьленьне непрадуктыўных выдаткаў на бюракратыю і паліцыю.

10) За танныя і адпавядаючыя санітарна-гігіенічным варункам паляпшэньні для работнікаў і беднаты.

11) За ахову над хворымі інвалідамі, старцамі і сіротамі праз будову прыпынкаў, санаторыяў, дзіцячых садоў і інш.

12) За паляпшэньне стану работнікаў, якія працуюць на магістрацкіх работах.

13) За 8-гадзінны дзень працы.

14) За звальненьне палітычных вязьняў.

Молат.

× **„Дзень Моладзі“.** Уноч з 1 на 2 верасьня с. г. у розных пунктах места былі павывешваныя вялікія чырвоныя сьцягі з рознымі процідзяржаўнымі лёзунгамі, падпісанымі К. П. З. Б.

Уноч з 2 на 3 верасьня с. г. па ўсім горадзе, а пераважна каля фабрыкаў і заводаў, была параскідвана камуністычная літэратура—адозвы.

4 верасьня — у сувязі з прыпадаючым сьвяткаваньнем сусьветнага „Дня Моладзі“— у м. Горадні а 3 гадз. дня камуністычная моладзь у ліку каля 300 асоб дэманстратыўна, з вялікімі чырвонымі сьцягамі, зладзіла паход. Паход распачаўся ад фабрыкі Касоўскага пяяньнем „Інтэрнацыяналу“ і на вуліцы Лістоўскага пакіраваўся ў бок вастрогу. Дайшоўшы без перашкоды да вастрогу, пад крыкі „ўра“! выкінулі некалькі рэвалюцыйных лёзунгаў і разыйшліся.

Народны.

Карэспандэнцыі.

Куды конь з капытам, туды й рак— з кляшнёй.

(м. Шаркаўшчына, Дзісеншчына).

У нядзелю на Прачыстую ў нас быў вялікі фэст. У гэты самы дзень і стараверы асьвячалі сваю новую малельню. Народу было шмат. З гэтага скарыстаў пан пасол Ярэміч і ўладзіў мітынг. Перад пачаткам прадавалася газэта Сялянская Ніва, але пасьпеху продажа ня мела, тады пачалі раздаваць дарма. Адзін селянін запытаў у пана пасла, чаму гэта ў газэце напісана, што зямля селяніну бяз выкупу, а яе трэба купляць. Пан пасол спакойна на гэта адказаў: „А хто каму, што дарма дае. Калі хочаш мець, трэба купіць“. Такая адповедзь не здаволіла сабраўшыхся. Чутны былі па ўсіх кутках гутаркі, што гэта ня наш пасол, хоць ён і стараецца ўлезьці ў нашу скуру, што нашы паслы, нашы праўдзівыя абаронцы сядзяць за кратамі і г. д. Па заканчэньню мітынгу з цяжкім сэрцам разыходзіўся народ, нясучы ў душы думку ці хутка ён пачуе сваіх родных паслоў, сваіх верных змагароў за лепшую будучыню.

Гаспадар возу.

Культурная праца.

(Вёска Палачаны, Маладэчанскі пав.).

12 жніўня г. г. Гуртком Т-ва Белар. Школы ў Палачанах быў наладжаны спэктакль. Згулялі „Боты“ і „Зьбянтэжаны Саўка“ Родзевіча. Артысты гулялі надта добра, асабліва-ж выдзялялася сваею гульнёю Паўліна Белан у ролі „Магрэты“. Глядзельнікі былі надта задаволены з вечарыны, аб чым сьведчыць іх бадзёры настрой і дружныя апляндысмэнты.

Апрача гэтага спэктаклю, Гурток ладзіў вечарыны і ў акалічных вёсках, якія таксама прайшлі з вялікім пасьпехам.

Пры гэтым сябры шчыра дзякуюць грамадзянам Анатолю Бурачонку, які хоць і ня сябра Т-ва, але ў трудную мінюту, калі артыстка захварэла, выканаў і, можна сказаць добра, яе ролю і Гдалю Капэлёвічу, каторы шмат чым дапамог у ладжаньні вечарыны ў в. Палачанах.

Х.

Добры прыклад.

м. Азярніца, Слонімшчына.

На астатнім сходзе сяброў Азярніцкага гуртка Т. Б. Школы было прынята арганізаваць сэкцыі: харавую, тэатральную з дэклямацыйнай падсэкцыяй і музычную. Былі вызначаны кіраўнікі, якія адразу прыступілі да працы. Вынікаў працы ня доўга прышлося чакаць, бо 28 жніўня адбыўся першы, наладжаны сваімі сіламі, канцэрт. Беларускі хор у складзе 16 асобаў пад кіраўніцтвам сябры В. Врублеўскага прапяяў некалькі беларускіх і ўкраінскіх песьняў. Прыемна было чуць, як наша родная песьня шырокаю хваляю неслася па мястэчку і гукі ле быццам клікалі ўсіх абудзіцца ад сну і дружна ўзяцца за працу. Асаблівай сэнсацыяй было сольнае выступленьне адкае харысткі. Два разы прапяяла яна свой нумар але слухачы дамагаліся яшчэ і яшчэ. Пасьля дэклямацыі, якою асабліва зацікавіўся народ, бо як дэклямацыя, так роўна і зьмест вершаў хваталі, як кажуць, за жывое, бо было ўсе гэта свае, роднае, за якім мы так даўно ганяліся, якога мы так даўна дабіваліся і чакалі,—струнны аркестр сыграў некалькі беларускіх мэлёдыяў і куплетаў. Пасьля пад гукі гэтага-ж аркестроў адбыліся скокі, якія зацягнуліся аж да 3 гадзіны ночы.

Шчыра дзякаваў народ за тую ўцеху, якую даў яму гэты канцэрт. Разыходзіліся ўсе з надзеяй што ўжо пачынае сьвяціць сонца і ў наша ваконца.

Увесь даход з канцэрту пайшоў на бібліатэку, якая ў хуткім часе пачне сваю чыннасьць.

Не магу з прыемнасьцю не абзначыць таго факту, што мясцовая адміністрацыя ў ладжаньні гэтага, канцэрту ня толькі не рабіла перашкодаў, а йшла нам на спатканьне.

Сябра.

Справаздача з дзейнасьці Ліхасельскага Гуртка Т-ва Бел. Школы.

(З Баранавіцкага павету).

Справа тэатральная: 25. IV. 1927 г. ладзілі спэктакль у в. Ліхасельцах. Згулялі: „Заручыны Паўлінкі“, „Стараста“ і дэклямацыя вершаў. 22. V—1927 г. ладзілі спэктакль у в. Савічах, Вальнянскае вол.; паставілі: „Заручыны Паўлінкі“, „Гандаль дваццатага веку“ і дэклямацыя вершаў. 2. VI. с. г. паставілі ў в. Ліхасельцах: „Суд“, „Пасланец“ і дэклямацыя. 10. VII. с. г. у в. Пагарэльцах згулялі: „Суд“, „Заручыны Паўлінкі“ і дэклямацыя.

Справа школьная: 28. VIII. с. г. пасланы школьнаму інспэктару заявы і запытаньне ў справе пастановы куратара на пададзеныя дэкляряцыі ў 1926 г.

Апрача гэтага, Гурток мае на мэце адчыненьне курсаў для дарослых.

Управа Ліхасельскага Г-ка Т-ва Б. Ш.

Выбары у Самаурады.

Няма палажэньня бяз выхаду.

(Выбары ў валаснай гміне).

У Валожынскай гміне адбыліся выбары ў гмінную раду.

Паны зрабілі свой сьпісак, дамяшаўшы туды беларусаў — падлізьнікаў.

Быў сьпісак і жыдоўскі.

Вясковыя жыхары падалі сваіх кандыдатаў, ужо запраўдных беларусаў, але гэты сьпісак, з нейкіх там „фармальных“ прычынаў, ня быў прыняты.

„Ляпей за жыда, чым за пана“ — падумалі, і сыпнулі свае галасы на жыдоўскі нумар. У рэультаце ў гмінную раду ўвайшло 6 жыдоў.

Ці ня так толькі будзе і з выбарамі ў будучы Сойм?

Выбары ў Вялейскую мястовую раду.

Нарэшце і мы дачакаліся, калі выбарная хваля і да нас дакацілася, і мы пачулі сябе грамадзянамі, маючымі некаторае права. Пачалі і мы гутарыць па сваіх кутках пра выбары: Як-жа пачнем, каго выбраць, які благі, а які добры, хто падлізьнік, а хто—сама справядлівасьць? Аж тут раптам чуем, што якісь Кодзь Казімір ужо ходзіць з кандыдацкім лістом і сабірае подпісы. Пасьля ўжо мы даведаліся, што Кодзь, — ня хто іншы, як былы канакрад. Ен за царскія часы быў пазбаўлены правоў за тое, што пакатаўся на чужым кані. Ня думайце: ён навет із роду шляхоцкага, белая костка.

Як пачулі мы аб гэтым сьпіску, зараз пачалі варушыцца і мы. Стварылася ініцыятыўная група, якая злажыла свой беларускі сьпісак і, атрымаўшы належны лік подпісаў, пачалі гатовіцца да выбараў.

Сьпіс гэты быў зложаны, як агітацыйны. І праўда: сваё ён зрабіў. У беларускай тоўшчы пачалі гаманіць аб ім. Пачалі перабіраць па костачках кожнага кандыдата.

Канец толкам і перасудам, крытыкам і эгоістычным гутаркам палажыў мітынг, які быў наладжаны 23-га жніўня ў памешканьні жыдоўскай школы „Гэруэлія“, спэцыяльна нанятай для мітынгу. Адчыніў мітынг адказны за яго грам. Каляда Аляксандар. Ен-жа першы і прамаўляў. У кароткай сваей прамове грам. Каляда зрабіў нарыс: якое маюць значэньне выбары і вартасьць большага ліку радных у магістраце для беларускага насяленьня.

Другім гаварыў грам. Валынец Флегант, які ахарэктарызаваў асобу будучага раднага, якім ён павінен быць, і каго трэба выбіраць. Пасьля абвясьціў парадак дня і прыступілі да выбараў кандыдатаў у радныя.

Вынікі выбараў паказалі, што беларускае грамадзянства Вялейкі да выбараў аднесіцца з поўнай сьвядомасьцяй важнасьці гэтага пытаньня.

Галасавалі не за цэлы сьпісак, як прапанавала ініцыятыўная група, а па аднаму, як запрапанаваў адзін з сяброў, — і ўсё-ж такі на першых мейсцах асталіся тыя грамадзяне, якіх вызначала ініцыятыўная група з маленькай зьменай, як напрыклад: з 3-га мейсца ды на 6 і з 4 на 7—і наадварот.

Аднагалосна быў выбраны ў кандыдаты Валынец Флегант, за ім ідуць Брыль Янка, Цішка Аляксандар, Каляда Уладзімір, Петрыкевіч Раман, Альфэр Віктар, Шапшалевіч Янка і др.

Саля, якая можа зьмясьціць каля 200 асоб, была поўная, ня глядзячы на тое, што дзень быў не сьвяточны і ўсе пасьля працы. Разышліся з мітынгу з поўнай верай, што перамога будзе на нашай старане.

За тыдзень да выбараў было ўжо вядома, пад якімі нумарамі будуць сьпіскі, а мяноўна: № 1 „бацькі Кодзя“ міжнародны, бо ў ім ёсьць палякі, жыды, „тоже белоруссы“ і беларусы; № 2 польскі; № 3 наш беларускі і № 4 жыдоўскі.

За пару дзён да выбараў „бацька Кодзь“, намаляваўшы на васьмушцы паперы (не шкадаваў) № 1, пачаў разнасіць грамадзянам, гаворачы, што яго сьпіс праўдзівы, бяз фальшу, беларускі, а 3—гэта „камуністычны“, і за яго не галасуйце (за гэта мы на яго падмо у суд—за правакацыю. Вядзі барацьбу, але ганарова).

Пачуўшы пра гэту правакацыю „бацькі“, мы таксама надрукавалі паўтары тысячы нумароў, змабілізавалі сьвядомых беларусаў з моладзі на кожную вуліцу, якія разьнясьлі № 3 ў кожную хату.

Ня гледзячы на ўсю магчымую агітацыю, шмат людзей не пайшло на выбары,— ведама, па сваей несьвядомасьці, а некаторыя людцы затым, што любяць цалаваць у тое мейсца, адкуль ногі растуць, галасавалі за польскі сьпісак № 2. Дзеля гэтага мы атрымалі 5 мандатаў замест 7, як належала.

За Беларускі сьпісак галасавала 604 (па магістрацкаму сьпіску беларусаў, маючых права галасаваць, было 1100 з гакам).

Першы сьпісак атрымаў... аж 390 галасоў — бяз нуля! Паўнамоцнік гэтага сьпіску „бацька Кодзь“, бачучы, што дзела яго праваліся, ня гледзячы на правакацыю, набраўся такой „адвагі“, што ня прыйшоў і галасаваць.

Галасоў, якія пададзены былі за першы сьпісак ня шкода, будзем ведаць, з якімі людзьмі будзем мець дзела ў будучыні і аб якіх пагамонім калісь пазьней. Ня варта цяпер аб сьмяцьці грамадзкім шмат гутарыць.

Шмат беларусаў не галасавалі толькі за тым, што ў сьпіску магістрацкім іх ня было, ды тыя, якія былі ўнесены ў гэтак званую трэцюю кніжку, гэта значыць: грамадзян, што не даказалі свайго абывательства. Гэта віна ляжыць на сумленьні магістрацкіх урадоўцаў, а перадусім нашага раднага грам. Насадовіча, які клапаціўся толькі аб сабе. Гэта яго дзела было падняць гэтае пытаньне ў магістраце і, калі выбары былі ўжо назначаны, трэба было вызваць гэтых людзей і сказаць ім, каб яны дабіліся абывательства. А то пасылаць на шарварку, плаціць падаткі дык магістрат на гэта здатны, а як галасаваць дык ня маюць права. Сьмех ды й толькі. Людзі, якія па 35—40 гадоў пражылі ў Вялейцы, не залічаны абывателямі яе.

Можа гэта палітыка такая, пазбаўляючы беларусаў галасоў, самым мець больш шансаў на лішняга раднага, бо яшчэ прывяду прыклад: дзяўчат і хлапцоў 1906 года нараджэньня не запісалі ў сьпіскі, а сваіх дык пастараліся ўнясьці; гэта таксама ляжыць на сумленьні магістрацкіх ўрадоўцаў. Добра ўрадавалі—для сябе! Нававыбраным радным трэба будзе падняць гэтае пытаньне і пачысьціць трохі магістрат.

Былі і такія выпадкі, што мужа запісалі, а жонку не,—і наадварот.

Як бачыце, добрыя людцы, у нашым магістраце парадак, — лепшага ня трэба! А быў-жа там наш прадстаўнік, наш барацьбіт за нас, які чуць лоба не растаўчэць аб падлогу, молячыся, каб ізноў вярнулася царства памазаньніка, божага і каб ізноў яму атрымаць пасаду прыстава. Чакай, чакай чалавеча можа да чаго і дачакаешся. Вельмі яму хацелася ізноў папасьці ў раду, але хаценьне яго ня зьдзейсьнілася, бо не папаў. Думаў: прайдзе па першаму сьпіску (яго рук тварэньне!), але, як вышэй бачыце, сьпісак гэты з трэскам праваліўся.

А вось, што зрабіла з нашым сьпіскам адміністрацыя: яна пазбавіла выбарчых правоў кандыд. у радныя—былых грамадаўцаў.

Крычы ня крычы, а цябе пазбавілі права быць выбраным у раду і толькі. Сядзі і ня дыш, бо ня маеш права крычаць: ты—былы грамадавец. Вось куды захацеў, ізноў „дзялальнасьць выврòтова“, ізноў каб было „паньства ў небясьпецы“! Не, жартуеш: вось табе на гэта закуска:

Na podstawie porozumienia się z Panem Wojewodą Wileńskim z dnia 25.VIII 1927 roku ze względu na bezpieczeństwo Państwa i powierzonego mi terenu, skreślam z listy № 3 następujących kandydatów, poszlakowanych o należenie do Biał. Wł. Rob. Hromady, uznanej za organizację nielegalną, a mianowicie: 1) Wołynca Flegonda, 2) Szepszelewicza Sana, 3) Kaladu Włodzimierza, 4) Alfera Wiktora, 5) Pietrykiewicza Romana, 6) Alfera Stefana, 7) Guleckiego Gleba, 8) Koladu Aleksandra, 9) Uścinowicza Sufrona, 10) Alfera Pawła i 11) Alfera Aleksandra.

Starsta Wilejski, (podpis).

Пробавалі ратавацца, але нічога ня вышла. Хадзілі да старасты, пыталіся: чаму мы ня маем права быць выбранымі? Грамада-ж была легальнай партыяй, і судом мы не пазбаўлены права грамадзянства? Дык ён адказаў, што гэта ён робіць у паразуменьні з Ваяводам і толькі. Папрабавалі мы таксама паслаць тэлеграму Маршалку Пілсудскаму (аж 106 слоў), але выбары адбыліся, а мы ўсё чакаем адказу ад нашага высокага накравіцеля. Можа і дачакаем, а пакуль сонца ўзойдзе, раса вочы выесьць. Да Бога высока, а да цара далёка, як кажуць расейцы. Ну што-ж наша доля такая ўжо. Цярпець, зnative сіць крыўды, маўчаць і пісаць у сваю газэту. Няхай увесь сьвет ведае, як нам жывецца ў дэмакратычнай Польшчы, на сьцягу якой напісана: свабода, роўнасьць і брацтва.

Тэлеграму паслалі гэткага зьместу:

Warszawa. Do Pana Prezesa Ministrów Marszałka Piłsudskiego.

My kandydaci na radnych miasta Wilejki z wyborczego listu № 3 pismem Wilejskiego Starosty z dnia 29 sierpnia, L. 1868/III w porozumieniu z Wojewodą Wileńskim, skreśleni, jako byli członkowie Hromady, w liczbie siedmiu i czterech nie należących do żadnej partji. Jako byli Hromadowcy, taksamo i bezpartyjni nie pozbawieni prawa obywatela sądem. Liczymy rozporządzenie Starosty Wilejskiego pogwałceniem prawa, prosimy o ustalenie takowego. Wybory 4 go wrzesnia.

Wilejka powiatowa ziemi Wileńskiej, ul. D. Bernackiego № 2 (podpisy).

Жаднага адказу дагэтуль не атрымалі. Чаму? — Ня ведаем.

Выбранымі аказаліся 5 грамадзян беларусаў, якім жадаем памыснай працы ў барацьбе за нашу лепшую будучыню...

Польскі сьпісак атрымаў 3 мандаты, жыдоўскі — 4. Палякі самі не спадзяваліся, што атрымаюць 3 мандаты, але, дзякуючы прадажным беларусам, а таксама нашай несьвядомасьці, маюць тры мандаты.

Дык вось, добрыя людцы, як адбыліся выбары ў Вялейцы. І. будучыня, ня ў сьветлых калёрах рысуецца, калі мы да гэткай важнай справы будзем падыхадзіць так, як падыйшлі 350 грамадзян беларусаў, якія саўсім не галасавалі. Галасуй-жа яны, мы мелі-б большасьць у радзе, бо мернік быў-бы не 108, а якіх небудзь 120 ці 130, а то і больш бо калі 1918 галасоў, якія былі занесены ў сьпіскі выбаршчыкаў, разьдзяліць на 13, дык атрымаем мернік 147, і палякі, маючы 340 галасоў (а яны пастараліся, каб усе галасавалі, таксама і жыды), атрымалі-бы толькі 2 мандаты, а жыды на 432 выбаршчыкі атрымалі бы 3 мандаты. Астаецца на нашу долю 1146 выбаршчыкаў, падзяліўшы на мернік 147, атрымаем 7 мандатаў з хвастом, замест 5.

Як бачыце, перамога была-бы магчыма і з такім лікам беларускіх выбаршчыкаў, ня лічучы завет лізуноў, а вышла, што? Беларускі сьпісак атрымаў толькі 604 галасы. Сорам усім тым, хто не пайшоў на выбары і гэтым пазбавіў нас магчымасьці перамогі, бо ў такіх справах трэба ісьці супольным, шчыльным фронтам, ня лічачыся з асабістым я і з асабістой крыўдай. Няхай кожны ведаець аб гэтым у будучыні, бо яшчэ ў нас на носе выбары ў Сойм. Няхай кожны грамадзянін, які быў пазбаўлены права галасаваць, паклапоціцца, каб у магістраце, ён быў унесены ў першую кніжку, а не застаўся ў трэцяй.

Больш сьвядомасьці, грамадзяне, — і перамога будзе наша!

Выбаршчык.

Усячына.

Выраджэньне дынастыі Гогэнцоллернаў. Чым займаецца нямецкі „наступнік трону“.

Сын Вільгэльма II, „кронпрынц“ (наступнік трону), якому дазволілі прыехаць у Нямеччыну,—найляпей сваей асобай кампрамітуе працу нямецкіх манархістаў, якія з усіх сілаў стараюцца „адбудаваць“ для яго „бацькаўшчыну“, вярнуўшы яму— „законныя правы на панаваньне над Нямеччынай“.

Нямецкі „кронпрынц“ атрымаў дазвол пасяліцца ў Нямецкай Верхняй Сілезіі, у месьце Эльс. Але раптам разыйшлася вестка, што кронпрыц пастанавіў прыехаць у былую рэзыдэнцыю (месца пабыту) свайго бацькі—ў Потсдам, пад Бэрлінам, куды ўезд яму забаронены. Газэты зацікавіліся гэтай весткай, ды высьнілі цікаўныя абставіны, якія стварыліся ў Эльсе навакол асобы „наступніка трону“, дый якія змушаюць яго — ўцякаць з Эльсу!

Выясьнілася, што кронпрынц, як і „расейскі цар Кірыл“, натварыў ужо столькі амурных скандалаў ды п'яных авантур з рознымі „артысткамі“ й навет з „панямі з таварыства“, што навет найбольш манархічнае афіцэрства адвярнулася ад свайго „будучага павадыра“... Найпаважнейшыя мясцовыя „бюргеры“ ды афіцэры перасталі навет падаваць „наступніку трону“ руку... У апошнія часы дык даволі было кронпрыцу паказацца на якойсьці публічнай урачыстасьці, як шануючае сябе грамадзянства — масова пакідала сабраньне...

Усё гэта скланіла „будучага кайзэра“ да ўцёкаў з Эльсу...

Вось, як імсьціцца выраджаўшаяся ідэя, стаўшая непатрэбнай ды агіднай, на тых людзёх, якія — з тупагаловым упорствам — прадаўжаюць ей служыць...

БРАТЫ! НЕ ЗНІШТАЖАЙЦЕ СВАЕ БЕЛАРУСКАЕ ГАЗЭТЫ; ПРАЧЫТАУШЫ, АДДАЙЦЕ СУСЕДЗЯМ.

Рэдактар-Выдавец: П. Кумпяк.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.